# ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

№ 1 (179)
13 студзеня 2001 г.



СТАР. 3

**ПРОКЛЯТИЕ АМЕРИКАНСКИХ ПРЕЗИДЕНТОВ**
Все президенты США, избранные в нулевом году, плохо кончили

СТАР. 5

**ПОБЕДА ДЕМОКРАТОВ В ПЕРВОМ ТУРЕ**
Такой прогноз исхода президентских выборов дает Сергей Альфер из Белорусского центра конституционализма

СТАР. 5

**СОН ПРА БАРБАРУ**
У Купалаўскім тэатры адбылася прэм'ера п'есы Аляксея Дударава

СТАР. 7-8

**TV ПРАГРАМА** 15–21 студзеня




НАШ ВЕРНИСАЖ. «Кандидаты в президенты или Сизифов камень», художник А. СДВИЖКОВ-МАТХАУЭР

КОЛОНКА РЕДАКТОРА

## Вас нам так не хватает

Алексей КОРОЛЬ

**Вот и настал, покатился новый год. Первый год нового столетия, нового тысячелетия. Там, за условной чертой времени, остались праздничные тосты, яркие фейерверки, искренние пожелания, преувеличенные ожидания.**

В череде будней к нам вернулись старые тревоги и старые хлопоты. Магия условной даты поблекла в повседневной суете, но не исчезла. Каким будет новый век, вопрос не только философский, но и вполне житейский. Новый век – это реальное время жизни не неких абстрактных новых поколений, но наших детей, наших внуков. И нам вовсе не безразлично, каким он окажется для них: мирным, добрым, динамичным и интересным или унылым, застойным, страшным и катастрофичным.

Каким окажется – ответ все еще за нами. Речь здесь не только о политиках, но, конечно же, прежде всего о политиках. И, прежде всего о тех, которые у власти. И которые за семь лет своего бездарного правления под руководством «всенародно избранного» преуспели разве что в обеспечении самих себя. В то время, как народ нищал, страна безнадежно отставала.

Самое печальное и самое страшное: исправлять, расчищать и наверстывать придется без самых лучших из нас. Без Геннадия Карпенко. При жизни его, как и бывает в жизни, коллеги и соратники с ним спорили и договаривались, интриговали и заключали союзы. Его уважали и недолюбливали, подшучивали и хвалили, язвили и пели дифирамбы. Он шагнул в большую политику из кресла директора завода, он быстро стал политиком государственного масштаба в пору относительной парламентской демократии. Он, не колеблясь, перешел в оппозицию к Лукашенко одним из первых, еще на дальних подступах распознав диктаторские устремления этой особы. «*Лукашенко – это позор нации*», – его определение времен первой президентской кампании.

Помню, как иронизировали коллеги-оппозиционеры по поводу избрания Геннадия Дмитриевича общенациональным лидером. Но он им вскоре фактически стал, на деле, без формального голосования. И если существует сегодня объединенная демократическая оппозиция, то в том его бесспорная заслуга. И наверняка, будь он жив, сегодня не возникло бы споров о едином кандидате в президенты. Будучи широко известным населению, привлекательным для интеллигенции, уважаемым номенклатурой, он не оставлял Лукашенко шансов на победу в президентских выборах. Ну как тут не возникнуть подозрению, что безвременная смерть Геннадия Карпенко наступила вовсе не случайно. Этот вопрос задали не оппозиционеры – народная молва.

Не хочется верить, отказываешься думать, что вошли мы в новый век без талантливых и сильных: Виктора Гончара, Юрия Захаренко, Анатолия Красовского, Дмитрия Завадского. Власть, допустившая, тем более сотворившая, такое, – преступная власть. Но не о ней сейчас речь. О ней когда-нибудь свое слово скажет суд.

Виктор Гончар, теперь это видится с особой ясностью, стал бы для Лукашенко еще одним чрезвычайно опасным и практически непобедимым конкурентом на выборах, по любым правилам и на любых условиях. Яркая самобытная личность, он вызывал к себе неоднозначное отношение, но умел в решающие моменты объединять вокруг себя людей, снимать противоречия. Зная хорошо и Карпенко, и Гончара, уверен, что между собой и с другими они бы смогли договориться и собрать вокруг себя прекрасную команду.

Увы, их нет. Их очень не хватает. Но есть другие. И нельзя проиграть. Главный шанс на победу демократической оппозиции может дать лишь объединение сил, полная координация действий. В конце концов, это еще и долг памяти.

ГЕЙ, СЛАВЯНЕ

# ИНТЕГРАЦИОННЫЙ ОБЛОМ

Александр КАВАЛЬСКИЙ

**Несмотря на иррациональный характер идеологических посылов, пропагандистских лозунгов и заклинаний Лукашенко о мифическом славянском единстве, в основе интеграционной истерии всегда лежали сугубо прагматические интересы.**

### Эпоха Ельцина

В 1992 году Егор Гайдар ввел российскую валюту, чтобы оградить себя от советских рублей, что бесконтрольно эмитировали братские (но уже независимые) республики, раскручивая в России инфляцию. Этой денежной реформой российские монетаристы снимали со своей шеи иждивенцев. Дружба – дружбою, но денежки врозь. Борис Ельцин давал всем понять, что халявы больше не будет: Россия медленно, но верно повышала цены на экспортируемый газ, нефть и другое сырье.

К белорусской гордости можно сказать, что из всех лидеров бывших советских республик только Лукашенко удавалось продолжать банально разводить Россию на бабки. Сняв с российско-белорусской границы таможенный контроль, наш президент не только получил по дешевке продукцию «Газпрома», но и в счет оплаты навязал России продукцию белорусской промышленности по ценам значительно выше рыночных.

А сколько недосчиталась Россия от бутлегерской деятельности различных фирм и фондов, освобожденных от налогов Лукашенко и заливших одну шестую часть суши беспошлинной водкой? Вероятно, откат от такого бизнеса (не верится, что отката не было) пошел в так называемые президентские внебюджетные фонды. Борис Ельцин прекрасно был осведомлен о шалостях своего младшего коллеги и понимал, что, по выражению Валерии Новодворской, «*пан Лукашенко предлагает ему скинуться опять на маленький интернационал на двоих (выпивка и закуска – за российский счет)*». Но катастрофически низкая популярность заставляли его закрывать на это глаза и поддерживать интеграционные инициативы, подтягивая таким образом свой рейтинг.

Кроме экономической, была еще одна прагматическая сверхзадача дружбы с Россией, которая не осталась незамеченной. Лукашенко почти открыто примерял на себя френч одного австрийского ефрейтора-интегратора, окрутившего в свое время веймарскую Германию. С прицелом на российский трон он окучивал российские регионы, очаровывая местных губернаторов-провинциалов. Но тут случилась незадача: от дряхлеющего Ельцина власть перешла к энергичному гэбэшнику Путину. Александр Григорьевич этого не предвидел и к ситуации оказался не готов.

### Эпоха Путина

Со сменой ответственного квартиросъемщика Кремля халява для Лукашенко закончилась. Пришел черед самим смазывать интеграционные салазки. Новый подход виден на примере валютного соглашения. Путин не Ельцин, ему за рейтинг пока волноваться не приходится.

➲ *Окончание на стр. 5*

ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

# Заграница нам поможет, или с нами Буш

**Перефразируя Ильфа и Петрова, Андрей Санников есть фигура приближенная. Как бессменный обладатель портфеля теневого министра иностранных дел, он по роду деятельности лучше всех осведомлен о том, что готовит коварный Запад белорусам в наступившем году. Подробнее об этом и другом в интервью Андрея Санникова «Згоде».**

– *Прежде всего, могли бы Вы подвести итоги прошедшего года?*

– Если говорить о прошедшем годе, то в центре внутренней и внешнеполитической жизни государства были так называемые выборы. В области внешней политики делалась большая ставка на то, что удастся добиться признания режима. Но, как вы знаете, вопрос о легитимности власти стоит по-прежнему. Сработала кампания бойкота. Даже не то, что сработала. Просто наивно было Лукашенко надеяться, что такими косметическими мерами, как завоз сюда туристов под видом наблюдателей, можно будет обмануть мировое сообщество. Главный политический итог года заключается в том, что международное положение Минска осталось прежним, попытки Лукашенко прорвать изоляцию оказались неудачными.

– *В декабре в Минске побывала миссия МВФ. В условиях глобализации экономическое партнерство куда важнее, чем дипломатическое. Может быть, юридическое признание не так уже и важно для Запада?*

– Во-первых, миссия МВФ ни о чем существенном с Лукашенко не договорилась. Во-вторых, приезд чинов МФВ нельзя рассматривать как признание. Беларусь является членом ООН, МВФ, также как и других международных организаций. Деятельность МВФ находится под контролем общего процесса демократизации. Это совершенно понятно, потому, когда начнется экономическая либерализация, также вступят в силу и политические демократические механизмы.

– *Вам не кажется, что неучастие Беларуси в международных структурах является своеобразной гарантией ее суверенитета? Можно вспомнить, как не так давно финансовые группы спровоцировали кризис в России и Юго-Восточной Азии, продемонстрировав таким образом беззащитность государственных институтов перед лицом международных финансовых структур.*

– Я не знаю, насколько важную роль сыграли международные институты в этом региональном кризисе. Я не думаю, что здесь надо винить финансовые организации, тем более что удалось достаточно быстро стабилизировать ситуацию с помощью тех же кредитов и рекомендаций МВФ.

Государство не утрачивает своей функции. Суверенитет необходим для защиты граждан, например, против какой-то олигархической группы. Суверенитет не означает самоизоляцию. То, что сейчас происходит, можно назвать формой суверенитета, который обозначает самоизоляцию.

– *А как же инициативы Лукашенко в Африке и арабском мире?*

– Мне не думается, что это тот регион, с которым надо связывать наше будущее. Будущее Беларуси на западном рынке, прежде всего на рынках, связанных с новыми технологиями. Оживить экономику могут только масштабные инвестиции с Запада.

– *Белорусская демократическая печать, в частности «Свободные новости» и «Наша свобода», комментируя ближневосточный конфликт, однозначно поддержали еврейскую сторону. Это что, реакция на арабские контакты Лукашенко? Вы разделяете эту точку зрения?*

➲ *Окончание на стр. 5*

## АНЕКДОТ-С

– Какой урожай будет в 2001 году?

– Средний: хуже, чем в прошлом году, но лучше, чем в будущем.

* * *

– Что такое свобода слова для белорусского чиновника?

– Это осознанная необходимость молчать.

* * *

Пенсионер, владеющий немецким языком, предлагает свои услуги. Языка взял еще в 43-ем...

## НАВІНЫ

**ПОШУК.** 7 студзеня споўнілася роўна паўгода з часу знікнення аператара ОРТ Змітра Завадскага. 5 студзеня жонцы Змітра Святлане Завадскай у пракуратуры было заяўлена, што ніякімі звесткамі пра лёс яе мужа следчыя не валодаюць. Аднак Святлане ўсё ж удалося даведацца, што фармулёўка абвінавачання чатыром арыштаваным па справе знікнення Змітра зменена: раней іх абвінавачвалі ў выкраданні і забойстве Завадскага, а зараз – толькі ў выкраданні. Па словаў Святланы Завадскай, «*можна спадзявацца, што Змітра камусьці перадалі і ён жывы*».

**ВЫКУП.** Мінулымі выхаднымі ў Петрыкаве была абясшкоджана групоўка, якая выкрала студэнта аднога з мінскіх ВНУ і патрабавала за яго свабоду грошы – болей за 100 000 *USD*. Следства высветліла, што арганізатарм злачынства з'яўляецца жанчына, банкаўская работніца, якая аказалася ў змове з раней асуджанымі асобамі. Усе чальцы злачыннай групоўкі арыштаваныя, усе яны грамадзяне Беларусі.

**ГРОШЫ.** Беларуска-расійскае пагадненне аб увядзенні ў дзеянне адзінай грашовай адзінкі можа набыць сілу толькі пасля ўнясення зменаў у Канстытуцыю. З такім заключэннем выступіла Міністэрства юстыцыі. Адзін з пунктаў дамоўленасці прадугледжвае правядзенне эмісіі расійскага рубля, будучай валюты саюзу Беларусі і Расіі, якая будзе ажыццяўляцца Цэнтрабанкам Расіі. Аднак гэтая норма супярэчыць артукулу 136 Канстытуцыі. Там пазначана, што выключным правам эмісіі грошай на тэрыторыі краіны валодае Нацыянальны банк, а нацыянальнай грашовай адзінкай у Беларусі з'яўляецца беларускі разліковы білет.

**СТРАЙК.** Намеснік старшыні Беларускага прафсаюзу прадпрымальнікаў Леанід Каліценя лічыць, што акцыя гандляроў, якая прайшла 1–5 студзеня, завершылася паспяхова. Тым не менш, рэакцыі на яе з боку дзяржаўных органаў пакуль няма. Бліжэйшым часам кіраўнікі БПП ініцыююць правядзенне сустрэчаў з прадстаўнікамі ўладных структураў. Асноўная частка прадпрымальнікаў вярнулася да працы, гандляры Барысава і Ваўкавыску працягваюць страйкаваць.

**ВЫБАР.** Кіраўнік БСДП Мікола Статкевіч мае намер балатавацца ў дэпутаты Нацсходу па 107 акрузе Мінску. Зараз заканчваецца фармаванне ягонай ініцыятыўнай групы, якая будзе налічваць каля 50 чалавек. У часе восеньскай выбарчай кампаніі Статкевіч балатаваўся па той жа акрузе, аднак выбары ў ёй былі прызнаныя неадбыўшымісяся з прычыны недастатковай яўкі выбаршчыкаў.

**КОНКУРС.** БАЖ сумесна з Каардынацыйнай радай «Рэгіянальная Беларусь» аб'явілі сярод недзяржаўных газет конкурс на лепшае асвятленне дзейнасці рэгіянальных грамадскіх, палітычных, прафсаюзных арганізацый у 2001 годзе. Пераможца конкурсу будзе вызначаны па выніках першага паўгоддзя, ён атрымае дыплом і каштоўны падарунак.

**ДОШКА.** Рада па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Пінскім гарвыканкаме адмовіла ў дазволе на ўстаноўку памятнай дошкі на доме маці Сяргея Дудко, які загінуў на расійскай падводнай лодцы «Курск». На рашэнне паўплывала рада ветэранаў ваенных маракоў Пінску, якая паведаміла, што Дудко не з'яўляецца ні ўраджэнцам, ні жыхаром Пінску. Між тым, яго бацькі – карэнныя пінчукі.

**ПРАГНОЗ.** 2001 год чакаецца цяплейшым за папярэднія. Навукоўцы пакуль не могуць дакладна вызначыць прычыны гэткіх прыродных працэсаў. Калі гэта звычайныя цыклічныя ваганні клімату, то бліжэйшым часам наступіць пахаладанне. Калі ж цяперашняе пацяпленне выклікана дзейнасцю чалавека, то ў наступныя гады яно будзе працягвацца. І тады ў бліжэйшыя 30 гадоў адбудзецца раставанне льдоў Антарктыды і падвышэнне ўзроўню ўсясветнага акіяну на 10–15 сантыметраў. Гэта, у сваю чаргу, выкліча падтапленне раёнаў, дзе зараз жывуць каля 800 мільёнаў чалавек. У Беларусі гэтыя працэсы могуць выклікаць істотныя змяненні ў аграрным сектары краіны.

**ПРЫСУД.** З фармулёўкай «*парушэнне парадку правядзення пікету*» суд Чыгуначнага раёна Віцебска вынес папярэджанне двум актывістам мясцовай арганізацыі АГП, а двух пакараў штрафам у памеры 150 мінімалак. Падставай прысуду стаў пікет у гонар Дня абароны правоў чалавека 10 снежня, які чальцы арганізацыі правялі на недазволеным гарадскімі ўладамі месцы. Актывісты АГП лічаць вердыкт суда несправядлівым з прычыны пратэрміноўкі паведамлення аб рашэнні выканкаму.

**БУНТ.** Штурмам АМАПу завяршыліся хваляванні ў Віцебскай працоўна-выхаваўчай калоніі, адзін з будынкаў якой 6 студзеня захапілі зняволеныя. У калоніі ўтрымліваліся некалькі соцень дзяцей, якія і распачалі мяцеж. Ёсць параненыя з абодвух бакоў. Зняволеныя патрабавалі вызвалення некалькіх чалавек, якія ўтрымліваліся ў дысцыплінарным ізалятары. Пазней былі вылучаны патрабаванні змяніць адміністрацыю, дазволіць захоўваць у казарме прадукты харчавання, адмяніць абавязковае хаджэнне шыхтом з песнямі і запрасіць на тэрыторыю калоніі прадстаўнікоў мас-мэдыя.



Фота REX/Photo DD

## ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

**БЫЛОЕ И ДУМЫ**

*«У нас были великие партизаны. Вы знаете их имена»*

(А. Лукашенко, БТ, «Панарама», 6.01.01)

**ФОНЕТИКА**

*«Хочешь быть услышанным – заговори»*

(Л. Лазарь, «Советская Белоруссия», 10.01.01)

**ТЯЖЕСТЬ**

*«Очень тяжело государства выходят из затяжного кризиса после распада СССР»*

(Н. Васьков, «Рэспубліка», 10.01.01)

## ГРОШЫ-1

# Нулёў стала менш

Таццяна ПАПОВА

**Зь першага студзеня новага году беларускім насельнікам стала прасьцей лічыць нулікі на сваіх разьліковых білетах. Цяпер намаляваныя чырвоным цэньнікі ў крамах адпавядаюць лічбам, пазначаным на купюрах.**

Тым ня менеі, доўгія чорныя кошты ня зьніклі з крамных паліц. У народнай сьвядомасьці грошы з нацюрмортам застаюцца мільёнамі. Ад гэтых мільёнаў ды іншых купюр старога ўзору грамадзтва сьпяшалася пазбавіцца да надыходу новага тысячагодзьдзя, бо цяпер касіры не прымаюць такія грошы.

Каб памятыя жыцьцём і карыстальнікамі, зробленыя цяжкай працай паперкі можна было абмяняць на хлеб у гастраноме ці квіточкі ў шапіку, цяпер трэба завітаць у якое-небудзь адзьдзяленьне ашчаднага банку. Супрацоўніцы гэтых устаноў бязь лішніх слоў і абурэньняў будуць мяняць тысячы на рублі аж да 2003 году. Таму, калі не хапае на пляшку піва некалькіх *BYB*, а ў кішэні засталося некалькі шматнулёвых паперак, саромецца банкаўскіх служак ня варта.

Кошты на піва пакуль застаюцца на мінулагоднім узроўні. На яго, як і на іншыя прадукты ў дзяржаўных гастарномах, распаўсюджваецца патрабаваньне Лукашэнкі забясьпечыць народ таннымі прадуктамі да зімовых сьвятаў. Цэньнікі даводзіцца мяняць кірмашовым гандлярам.

Першы навагодні тыдзень для іх стаўся ня дужа ўдалым. Народ набіваў страўнікі запасамі, нарыхтаванымі ў лядоўнях, і не сьпяшаўся на рынкі. Рэдкія спажыўцы, што ўсё ж зьяўляліся на кірмашах, дзівіліся новым коштам і сваім нежаданьнем траціцца зьбівалі кошты да сьнежаньскага ўзроўню. Але запасы лядоўняў хутка скончацца, новыя пастаўкі на беларускія рынкі будуць, як звычайна ў студзені, даражэйшымі. На колькі, гандляры казаць адмаўляюцца, спасылючыся на тое, што яны толькі выконваюць загады свайго начальства, якое й прызначае кошты. Складана паверыць, што людзі з багатым досьведам працы ў гандлі ня могуць даць якіхкольвек прагнозаў. ■

## ГРОШЫ-2

# Укладчыкі «БелБалтыі» пратэстуюць

Галіна ЗІНКЕВІЧ

**Кожны аўторак і чацвер Нацбанк асаджае натоўп падманутых укладчыкаў.**

Кліенты перакананы, што ў банкруцтве ёсць немалая віна дзяржаўных фінансавых службаў, у прыватнасці дэпартамента нагляду, якім кіруе пракурор Грыгаровіч.

Амаль год «БелБалтыя» (па кастрычнік 2000-га) прымала грошы ад насельніцтва, не маючы на тое права: яе ліцэнзію адклікаў Нацбанк. Толькі калі ініцыятыўная група ўкладчыкаў пачала самастойна даследаваць справу, была створана дзяржаўная камісія, а Нацбанк паспешна надрукаваў пастанову, згодна з якой дагаворы, заключаныя з парушэннем закону, аб'яўлены несапраўднымі.

Людзі, прывабленыя высокімі банкаўскімі стаўкамі «БелБалтыі», ахвотна неслі туды свае грошы. Цяпер сярод іх ходзяць чуткі, што гэтыя сродкі пойдуць на прэзідэнцкую выбарчую кампанію.

Непрыгожую крэдытную гісторыю, верагодна, пастараюцца замяць, як гэта ўжо здарылася з «*Поиском*» ды з іншымі праблемнымі банкамі. Толькі ў «БелБалтыі» становішча нашмат крымінальней. Невыпадкова збег за мяжу адзін з намеснікаў, а старшыні, сп. Барсегяну, пагражае крымінальны артыкул аб махлярстве.

## РЭГІЁНЫ

# Страйк завяршыўся, страйк працягваецца

Ян КАЛІНОЎСКІ

**З 1 па 5 студзеня 2001 года па ўсёй краіне праходзіў страйк прадпрымальнікаў.**

Асноўнай прычынай, якая прымусіла прыватных гандляроў звярнуцца да такой нязвыклай формы барацьбы, было ўвядзенне мытных пошлінаў за тавары з трэціх краінаў, што ўвозяцца з Расіі. Увядзенне мытных пошлінаў прымушае гандляроў на рынках падвышаць кошт тавараў ажно на 40 працэнтаў, што робіць іх непакупнымі для большасці збяднелых беларусаў. А тут яшчэ трэба плаціць значныя падаткі, а да таго ж папярэдне.

Неаднаразова прадпрымальнікі звярталіся да ўладаў, але тыя не реагавалі на звароты прадпрымальнікаў. У выніку прадпрымальнікі пайшлі да такой, тыпова пралетарскай формы, барацьбы, як страйк. Падтрымалі страйк і гандляры на Віцебшчыне. Не працавалі рынкі ў Віцебску, Полацку, Наваполацку, Оршы.

У той жа час прадстаўнікі прафсаюза прадпрымальнікаў «Садружнасць» гандлявалі. Праўда, іх было няшмат і агульнае ўражанне яны не сапсавалі: прадпрымальнікі страйкавалі даволі аднадушна. Страйк працягваўся да 5 студзеня. 6 студзеня большасць прадпрымальнікаў выйшла на працу. А вось у Віцебску страйк працягнецца яшчэ на тыдзень. Так вырашылі віцебскія прадпрымальнікі на сваім сходзе, што адбыўся 5 студзеня на Полацкім рынку.

Віцебскіх прадпрымальнікаў падтрымалі ў Оршы. Там становішча прадпрымальнікаў ускладняецца канфіскацыямі, якія праводзяцца міліцыянтамі. Выпадкаў канфіскацыяў апошнім часам было некалькі, апошні з іх быў на значную суму: ажно на 10 тысяч даляраў было канфіскавана тавараў у мясцовага прадпрымальніка. ■

## ПРАФСАЮЗЫ

# Моц і слабасьць гандляроў

Таццяна ПАПОВА

**У першыя пяць дзён новага году прадпрымальнікі ўсіх менскіх ды бальшыні беларускіх рынкаў не раскладалі сваіх тавараў у стракатых намётах. Такім чынам яны зладзілі сабе калядныя канікулы, бо гандаль у сьвяточныя дні ўсё адно ніякі.**

Вынаходлівыя гандляры прыменкавалі да пасьлянавагодняе пакупніцкае апатыі свой агульнарэспубліканскі страйк. Асноўным патрабаваньнем кірмашовых працаўнікоў стала адмена падвойных мытных пошлін пры правозе тавараў замежнае вытворчасьці праз Расію ў Беларусь. Не жадаючы перарываць прыемнасьцяў пасьлясьвяточнага адхадняку, страйк падтрымалі нават тыя прадпрымальнікі, якія прапануюць народу футравыя капелюшы беларускае вытворчасьці. Іх мытныя пошліны аніяк ня тычацца.

Ці пацягне акцыя за сабою станоўчыя зрухі – пакажа час. Цяпер жа прадпрымальнікі спадзяюцца на розум ды спагадлівасьць улад і патрабуюць перамоў з урадам рэспублікі. Як патлумачыў менскі лідэр прадпрымальніцкага прафсаюзу Леанід Каліценя, у Барысаве, Пінску й іншых мясьцінах Беларусі страйкі расьцягнуцца на некалькі тыдняў ці нават месяц.

Схільнасьць да пратэсту падмацоўваецца пасьпяховасьцю мінулагоднее лістападаўскае забастоўкі. Гандляры дамагліся спрашчэньня працэдуры сэртыфікацыі імпартнае побытавае тэхнікі й радыёапаратуры.

Сярод сваіх асноўных патрабаваньняў прадпрымальнікі вылучаюць непавышэньне фіксаваных тарыфаў на арэнду працоўных месцаў. Кірмашовае кіраўніцтва паабяцала ўзьняць іх ужо ў гэтым месяцы. Праблема тычыцца ўсіх гандляроў, таму лучыць нават не чальцоў прафсаюзаў, якія падтрымліваюць час ад часу прафсаюзьніцкую дзейнасьць не ўступаючы ў прафэсыйныя аб'яднаньні з-за сваёй ляноты ці з-за недаверу сварлівым прафсаюзным лідэрам.

Прафсаюз прадпрымальнікаў Беларусі першапачаткова зьяўляўся першаснай арганізацыяй Свабоднага прафсаюзу (беларускага). Страціўшы сваё рэгістрацыйнае пасьведчаньне, ён ня здолеў яго аднавіць з-за непаразуменьняў з дырэкцыяй СПБ па нейкіх фінансавых пытаньнях. Цяпер актывісты ад прадпрымальнікаў абвінавачваюць СПБ ў няслушным вытлумачэньні ўставу, неканструктыўнасьці й згодзе з КДБ. Яны маюць намер змагацца за сваю рэгістрацыю надалей.

Адылі, кіраўнік прадпрымальніцкага прафсаюзу на кожным куце крычыць аб сваім жаданьні ўзначаліць краіну пасьля сёлетніх прэзыдэнцкіх выбараў, гуртуючы ўсіх сваіх апанэнтаў у катэгорыю «*калгасна-камсамольскіх правадыроў*».

Наўрад ці зацертыя фінансавымі праблемамі прадпрымальнікі зьбяруць яму грошы на прэзыдэнцкую кампанію. Наўрад ці й камісыя па малых грантах пры амбасадзе ЗША здолее дапамагчы яму нечым большым, чым правядзеньне сэмінару для гандляроў. Пэўне, амбіцыйны прафсаюзьнік спадзяецца на выбаркамаўскія сродкі, бо сваіх ён ня мае. Нават яго афіцыйная электронная скрыня абслугоўваецца халяўнай расійскай паштовай службай.

Пакуль Валеры Леванеўскі ўзвышае свой рэйтынг, рассылаючы факсы аб нядаўнім затрыманьні свайго пятнаццацігадовага сына. За што ўзялі падлетка ў допісах не пазначаецца. Пры канцы кожнага ліста Леванеўскі нагадвае, што ўважае дзеяньні органаў як правакацыю «*супраць сям'і будучага кандыдата ў прэзыдэнты РБ*». ■

С ДРУГОГО БЕРЕГА

# ВТОРАЯ БАРХАТНАЯ РЕВОЛЮЦИЯ

## по телефону из Праги

*Комментируя происходящее в Чехии – стачку на телестудии ЧТ1 и стотысячные демонстрации пражан – наши газеты склонны цитировать любых политиков и дипломатов. Забывают при этом, что Чехия – Мекка белорусских политэмигрантов. А кто лучше, чем бывший земляк, растолкует нам суть происходящего? Скажем, участники демонстраций 1996–1997 годов А. Агидный (псевдоним), Микола Соловей и экспредседатель Партии любителей пива Андрей Ромашевский.*

**М. СОЛОВЕЙ:**

– Вообще, чехи меня приятно порадовали. У меня за время пребывания здесь сформировался имидж Чехии как страны аморфной. Взять Прагу, где все ненастоящее, а так, чтобы втюхать туристам. Зеркалом общества является его ТВ. Телевидение чешское – не фонтан, в частности ЧТ-1 – слабый канал. То же самое, что наше БТ, минус реклама. Совсем никудышный информационный блок. В качестве сенсации подают убийство или ограбление, затем репортаж из зоопарка, где родился тюлень. И только после этого политика. Меня это всегда раздражало.

В знак солидарности с журналистами на улицы выходит сто тысяч человек. Конечно, здесь сыграл роль фактор недовольства партией Клауса, с которой многие связывают несправедливую приватизацию. Но мне кажется, что в Чехии, в отличие от Беларуси, уже сформированы зачатки гражданского общества. Так просто несправедливость здесь больше не пройдёт. Если и дальше трудовые конфликты начнут решаться таким радикальным способом, то здесь грядет новая революция. Обидно, что белорусские политэмигранты все в шапку проспали. Сейчас в чешской столице мертвый сезон, туристов вплоть до марта не предвидится. Для нас это значит безработица. Тяжелые времена, когда больше думаешь о хлебе насущном.

**А. АГИДНЫЙ:**

– Я за событиями слежу постольку-поскольку, ведь для эмигранта, главное – это работа. Кроме того, я боюсь стать жертвой манипуляции. Хотя голодающих журналистов и жалко, но дело не в них. Главные причины телевизионной войны не афишируют. Их две. Прежде всего, вопрос, кому достанутся деньги, выделенные на реформу ТВ. Всем ясно, что сохранять ЧТ-1 в нынешнем виде смысла нет. По качеству его можно сравнить с долистьевским ОРТ. Фильмов мало. Программы скучноватые. Поэтому выделены деньги. Деньги порядочные. Достаточно посмотреть на новое здание ТВ. Вот за бабки и идет схватка. Драка за ТВ – это лишь фрагмент борьбы между двумя фракциями местной элиты, группой Клауса и Земана.

Победят в конфликте те, кто поставил на журналистов. Потому что, в отличие от правых политиков, журналюги строят свои акции так, чтобы вызвать общественный резонанс.

Я тут смотрел программу, где сравнивали сентябрьские протесты анархистов против пражского саммита МВФ и нынешние демонстрации. Обозреватели спорили, почему тогда чехи дома отсиживались, а нынче сотнями тысяч выходят на акции. Ведь тогда насилия и крови – поводов для возмущения – было куда больше. А сегодня – только голодные обмороки.

Сейчас информация подается со знанием дела, коллегами-журналистами, солидарными с бастующими. Как только финансовый вопрос решат, пиар-кампания закончится, и все вернется на круги своя.

**А. РОМАШЕВСКИЙ:**

– Если бы я имел чешский паспорт, то, наверное, поддержал бы нового директора ТВ. Закон надо уважать. Но, как всякий эмигрант, я критически отношусь к любым властям, поэтому я на стороне журналистов.

Хотя телевизор я не смотрю, первый канал уважаю. Коммерческим студиям он, конечно, уступает, но зато здесь больше серьезных культурных программ. Он воспитывает настоящих чехов, а не потребителей.

Все решил психологический шок. Представьте себе, вы приходите домой, включаете телевизор, а там – черный экран. Это чехов из себя вывело. Значит, что-то в стране неладное происходит, если телевизор не работает.

Для тех, кто помнит август 68-го и советскую оккупацию, все, что происходит сейчас, – отзвук тех событий. Голодовки и протесты – тактика сопротивления диссидентов. Ассоциации со сталинистами не в пользу правых. Чтобы оправдаться, они говорят, что весь этот сыр-бор и заварили вчерашние диссиденты. Им скучно в сытой спокойной Чехии, вот они и развлекаются.

Как белорусская политическая эмиграция реагирует на все эти события? А никак не реагирует. Вот сейчас заглянет ко мне товарищ. Напьемся, будем смотреть на черный экран и ржать. Тут свой прикол: каждый час новый директор делает свои пятиминутные новости. Пять минут идут новости, а затем снова хлоп – и опять черный экран. ■

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ

**Китай.** Китай спешно форсирует вхождение во Всемирную торговую организацию. Уже на следующем саммите ВТО 10–17 января он может быть принят в ее члены. Спешка объясняется приходом в Белый дом нового президента. Клинтоновская администрация была сторонником нормализации отношений с Пекином и лоббировала его вхождения в ВТО, забывая подчас о судьбах диссидентов. С Бушем, который намерен проводить жесткую линию, такие фокусы не пройдут.

**Испания.** Испанское правительство продолжает крестовый поход против баскского сепаратизма. Крупным успехом стало постановление баскского парламента, обязавшее региональный канал транслировать предновогоднюю речь короля Хуана Карлоса Бурбона. Однако за час до боя курантов совет телевидения, ссылаясь на закон о независимости СМИ, решил не крутить ролик с монархом. В итоге в новый год страна басков вошла без напутствия Мадрида. Правительство назвало решение журналистов «*националистическим саботажем*» и объявило локаут.

**Германия.** В XIX столетии бичом европейских кабинетов был призрак коммунизма. Ныне – коровье бешенство. Очередной жертвой говядины стал кабинет Герхарда Шредера. 9 января, вопреки всем заверениям правительства, в Германии обнаружили сразу 10 случаев губчатой энцефалопатии. Учитывая, что первая немецкая больная буренка была зарегистрирована лишь в ноябре, масштабы распространения заразы впечатляют. Выводы последовали незамедлительно: министры сельского хозяйства и здравоохранения отправлены в отставку. Страну охватила паника и поголовный переход в вегетарианство.

**Франция.** В боевых условиях встречали Новый год наследники комиссара Мегре. Буквально накануне корсиканская террористическая организация *Armata Corsa*, заявила, что намерена провести в новогоднем Париже серию взрывов. Всю ночь усиленные подразделения полиции прочесывали город, но ничего не обнаружили. Утром *Armata Corsa* прислала сообщение, что день корсиканского возмездия переносится на 1 февраля.

**Германия.** В преддверии грядущих выборов в бундестаг глава немецкого МИДа Йошка Фишер кардинально меняет имидж. Вдохновитель косовской операции НАТО заявив, что насилие – не метод решения политических проблем, принес публичное извинение одному бывшему спецназовцу. Этот полицейский имел неосторожность разгонять в 1975 году демонстрацию леваков и попал их лидеру Йошке под горячую руку. Сегодняшним раскаяньем Фишер хочет завлечь пацифистскую интеллигенцию голосовать за «зеленых». Сами «зеленые» речь своего партайгеноссе осудили, решив, что «*корень проблемы насилия – подчас сами полицейские*».

**Ирак.** Чтобы выкурить остатки аджалановской Рабочей партии из ее баз в северном Ираке, Анкара решила прибегнуть к помощи самих курдов. Речь идет об отрядах происламского Патриотического союза Курдистана. В новый год, заваленный турецким оружием и деньгами, ПСК перешел в наступление на лагеря РПК. РПК отвечает той же монетой. Аджалановцы начали тайные переговоры с Саддамом о совместной борьбе против ПСК, для чего уже внесены необходимые поправки в партийную программу. Отныне главными врагами РПК провозглашены Америка и международный сионизм.

20 ЯНВАРЯ

# Проклятие американских президентов

Максим КОНСТАНТИНОВ

**Рано радуется Джордж Буш-младший, став 43 президентом США. Затянувшаяся эпопея с определением победителя президентских выборов заставила многих обозревателей вновь вспомнить о проклятии, наложенном индейским вождем Текумсе на всех американских президентов, избранных в год, оканчивающийся на «0».**

Вождь племени криков Текумсе, брат индейского пророка Тенкватавы, после провала попыток объединения всех индейцев в войне против белых наложил в 1840 году страшное проклятие на избранного девятым президентом США Уильяма Гаррисона и всех последующих его преемников. Смысл проклятия заключался в том, что всякий американский президент, избранный в год, оканчивающийся на цифру «ноль», не доживет до конца своего президентского срока.

**Уильям Гаррисон** заслужил особую нелюбовь краснокожих тем, что во время службы в армии он принимал активное участие в военных походах против индейцев на северо-востоке США. Его даже прозвали в честь одной из одержанных над индейцами побед «Старый Типпекану». Во время своей инаугурации Гаррисон, будучи уже в преклонном возрасте, во время чтения полуторачасовой речи простудился, подхватил воспаление легких и умер. С тех пор проклятие стало неизменно сбываться.

Следующей жертвой проклятья стал **Авраам Линкольн**, избранный на свой пост в 1860 году. После переизбрания на второй срок он был застрелен 14 апреля 1865 года в ложе театра актером, сторонником южан, Джоном Бутом.

**Джеймс Гарфилд** (избран в 1880 году) умер спустя несколько месяцев после инаугурации в сентябре 1881 года от ран, полученных во время покушения на железнодорожном вокзале в Вашингтоне. Убийцей оказался Чарльз Гито, сторонник одной из ультраправых организаций.

**Уильям Мак-Кинли** (1900 год), во время президентства которого США заявили о себе как о мировой державе, также не избежал участи своих собратьев по несчастью. Интересно, что во время дебатов в конгрессе после завершения войны с Испанией относительно судьбы бывших испанских владений он настаивал на принятии их в состав США. Президент считал, что Америка должна взять ответственность за судьбу *«наших маленьких коричневых братьев»*. Подобная экспансионистская внешняя политика Мак-Кинли не устраивала многих, в том числе революционеров-одиночек. В сентябре 1901 года при посещении Панамериканской выставки в Буффало он был застрелен из револьвера анархистом Леоном Чолгосом.

Перейдем к **Уоррену Гардингу** (1920 год). Период его правления считается одним из самых коррупционных в истории США. Он был любителем спорта, благородных напитков, покера, гольфа и красивых женщин. На должности в своей администрации он назначал своих давних приятелей-бизнесменов из штата Огайо, которые не преминули воспользоваться столь редкой удачей. Гардинг часто становился предметом сплетен и слухов благодаря своим частым любовным похождениям. До конца своего президентского срока он не дожил и умер в августе 1923 года, как сообщили в печати, от апоплексического удара.

**Франклин Делано Рузвельт** считается одним из самых выдающихся президентов в истории Америки. Он трижды переизбирался на свой пост в 1936,1940 и 1944 году. Благодаря его «новому курсу», который вызывал яростную критику со стороны консерваторов, Америка смогла выбраться из затянувшейся экономической депрессии и стать ведущей державой мира.



До победы над фашистской Германией Рузвельт не дожил, скончавшись 12 апреля 1945 года. Его смерть вызвала бурную радость Адольфа Гитлера, прятавшегося в бункере от американских бомбежек и искавшего утешения в гороскопах.

Одной из самых громких смертей XX века стало убийство в Далласе в ноябре 1963 года **Джона Кеннеди**, первого президента-католика в истории США. Убийцей оказался бывший рабочий Минского электролампового завода, известного нам как «Горизонт», американский марксист Ли Харви Освальд. Трагический конец Джона Кеннеди, переросший пять лет спустя в семейную драму в связи с убийством сенатора Роберта Кеннеди, способствовал созданию настоящей легенды вокруг клана Кеннеди. Остается лишь напомнить, что Джон Фицджеральд Кеннеди победил на президентских выборах в 1960 году.

**Рональду Рейгану,** которого угораздило быть избранным в 1980 году, можно сказать, повезло. Он стал первым президентом, избежавшим проклятия Текумсе. 30 марта 1981 года после выступления на съезде профсоюза строителей Рейган вышел из вашингтонского отеля «Хилтон» и направился к своему лимузину. Неожиданно его окликнули, а когда он обернулся, прозвучали выстрелы. Раненого президента затолкали в машину и срочно доставили в госпиталь. Пуля, попавшая в президента, застряла в легком, всего в двух дюймах от сердца.

Впоследствии Рейган заявил, что это Бог спас его, так как он еще нужен Америке. Стрелявшим оказался Джон Хинкли, признанный судом душевнобольным. Стоит еще отметить, что жена Рейгана Нэнси, видимо, после этого случая стала регулярно консультироваться с астрологами, согласовывая с ними президентский график.

Следующим в списке потенциальных жертв индейского проклятия может оказаться Джордж Буш-младший, с таким трудом избранный на свой пост в этом году.

Можно не верить в мистику в истории. Однако в нее могут верить разные психопаты, жаждущие геростратовой славы. Так что службе безопасности американского президента не стоит расслабляться. ■

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# Трансляцыя інтарэсаў

Віктар АБРАМОВІЧ, Магілёў

**Калі меркаваць па тэндэнцыі пастаяннага пагаршэння ўмоў жыцця беларусаў, то відавочна, што сілы, накіраваныя на рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў, у нас слабейшыя за тыя, што дзейнічаюць супраць Беларусі.**

На Беларусі 10 мільёнаў жыхароў, з іх, па розных звестках, 82 працэнта беларусаў. Яны хочуць быць здаровымі, мець сям'ю, гадаваць дзяцей, весці гаспадарку, добра зарабляць і жыць заможна. Усё гэта завецца беларускімі інтарэсамі.

Інтарэсы і ўсе, што іх тычыцца, падпарадкоўваюцца законам трансляцыі інтэрэсаў (ЗТІ) у наступных вызначэннях:

- трансляцыя інтарэсаў ёсць дэманстрацыя наяўнасці волі дасягнуць пэўнай мэты;
- інтарэс, які не транслюецца, не існуе;
- верагоднасць рэалізацыі інтарэса прапарцыйна інтэнсіўнасці трансляцыі;
- кожны чалавек транслюе інтарэсы той нацыі (тэрыторыі), на мове якой ён размаўляе (піша).

Веданне і выкарастанне ЗТІ дазваляе прымяніць да сацыяльных і палітычных з'яў матэматычныя метады. Напрыклад, гэты ліст транслюе беларускія інтарэсы толькі на 83 працэнта з магчымых 100.

Згодна з ЗТІ, моўная трансляцыя кожнага інтарэсу суадносіцца з пэўнай тэрыторыяй, якая належыць народу (тытульнай нацыі). Народ – носьбіт гэтай мовы. Трансляцыя інтарэсу, якая ажыццяўляецца на чужой мове з нейкай тэрыторыі, садзейнічае рэалізацыі чужога інтарэсу.

Паколькі трансляцыя інтарэсаў адбываецца за кошт уласных рэсурсаў, то мае месца пастаяннае выдаткаванне гэтых рэсурсаў. Але беларускія рэсурсы сёння марнуюцца ў лепшым выпадку безвынікова для Беларусі. Дабрабыт з'явіцца на Беларусі, калі беларусы асэнсуюць свае беларускія інтарэсы, якія зараз рознымі шляхамі, формай і сэнсам рэжым знішчае, размывае і падмяняе чужымі. Усе яго сілы і рэсурсу кінуты на стварэнне міражу настальгіі па СССР.

Камусьці здаецца, што мова ёсць спарава дзесятая ў барацьбе за беларускія інтарэсы. Але няма без мовы інтарэсу жыць заможна на Беларусі, няма нават беларускага інтарэсу жыць.

Беларуская мова ёсць рэсурс выключна беларускі і атаясамляецца толькі з тэрыторыяй Беларусі. Таму з яе выкарыстаннем транслююцца толькі беларускія інтарэсы. Выкарыстанне беларускай мовы вядзе да канцэнтрацыі рэсурсаў на нашай тэрыторыі.

Камусьці здаецца, што форма слова (яна бывае гукавая і графічная) не мае значэння, што галоўнае сэнс. Усё не так. Нават гук слова з'яўляецца сілай. Сілай, большай за сэнс, які нясе гэта слова. Прымусіць працаваць гэтую сілу на карысць беларускім інтарэсам – вось сэнс увядзення адзінай дзяржаўнай мовы. А тут розныя добразычліўцы прапіхваюць другую дзяржаўную мову. Добра, што не трэцюю. Не такія мы багатыя, каб раскідвацца сваімі рэсурсамі.

З дапамогай ЗТІ не складае праблемы адрозніць кандыдата ў прэзідэнты, правадніка беларускіх інтарэсаў, ад кандыдата, які працуе і будзе самаддана працаваць супраць беларускіх інтарэсаў, а значыць і інтарэсаў і беларускіх выбаршчыкаў. Тых, кто ведае ЗТІ і зацікаўлены ў дабрабыце, ніякая маскіроўка ці дымавая завеса ўжо не здольны сёння дэзарыентаваць.

Згодна з ЗТІ, учынак чалавека з найбольшай дакладнасцю сведчыць аб яго інтарэсе. Выбіраючы мову сваёй размовы чалавек робіць выбар паміж інтарэсам беларускім і нейкім іншым.

Чалавек заўсёды мовай транслюе свой інтарэс. Выказаны мовай інтарэс можна ўзмацніць або паслабіць сэнсам сказанага. Але ніколі пажаданне, выказаннае ў сэнсе, не перабольшыць учынак.

Падчас выбараў, ды і без іх, на розных нарадах выступаюць нейкія людзі, якія транслююць розныя інтарэсы. А простыя памяркоўныя беларусы вераць усяму, што тыя гавораць. Шукаюць свой інтарэс у тым, у чым для беларуса яго і быць не можа А потым дзівяцца, чаму жыць становіцца горш і горш. А варта было б толькі звярнуць увагу на мову.

Свае інтарэсы чалавек транслюе бесплатна, чужые – за грошы. А вось каб чужыя ды бясплатна – гэта толькі ў Беларусі такое можа здарыцца.

СТАТЫСТЫКА

# ПАДВЯЛІ РЫСУ

Тацьцяна ПАПОВА

**Па гарачых сьлядох адышоўшага 2000-га году беларускае прадстаўніцтва ААН прэзэнтавала грамадзкасьці штогадовую нацыянальную справаздачу аб чалавечым разьвіцьці ў нашай краіне за мінулы год.**

Ад папярэдніх аналягічных дакумэнтаў гэты зборнік адрозьніваe новы склад аб'ектыўных аўтараў. Вынікі іх аналітычнае дзейнасьці нарэшце рэальна абмалявалі становішча, у якім знаходзіцца цяпер Беларусь.

Не вядома, на якое месца Беларусь зьменіць сваё ганаровае 57-е пасьля таго, як бальшыня складальнікаў аанаўскае справаздачы выказала занепакоенасьць памяншэньнем рэальных даходаў насельнікаў і, як вынікам, фактычным існаваньнем больш як паловы зь іх за мяжой беднасьці. Бясспрэчным застаецца сьцьверджаньне афіцыйных колаў, што для галоты ў Беларусі існуе сыстэма сацыяльнае падтрымкі і што выдаткі з сабраных у бюджэт падаткаў на гэтыя мэты з кожным годам растуць.

Між тым агульная сума ўсіх ільгот, датацый ды сацыяльных выплат жабракам не перавышае 20 адсоткаў дзяржаўнага марнатраўства. Ільвіная доля бюджэтных выдаткаў траціцца на 20 адсоткаў найбольш забясьпечаных беларускіх насельнікаў.

Урад Лукашэнкі пакуль не мае моцы для таго, каб выправіць такія паказальнікі. Таму на падтрымку беларусамі сваіх рэформ яму разьлічваць не даводзіцца. Шмат надзей у гэтым пляне было зруйнавана разам зь няспраўджаным чаканьнем эканамічнага росту, які павінен быў прывесьці да паляпшэньня дабрабыту людзей, падтрыманьню высокага ўзроўню занятасьці і, адпаведна, мусіў узьняць іх зацікаўленасьць у пераўтварэньнях. Але паміж макраэканамічнымі паказальнікамі й дабрабытам беларускіх жыхароў на працягу апошніх гадоў усталявалася адваротная залежнасьць.

Як аргумэнтам у сваю абарону беларускія ўлады могуць выкарыстаць статыстыку Міжнароднага інстытуту мэнэджмэнту ў Лазане. Тамтэйшыя навукоўцы падлічылі, што якасьць існаваньня беларусаў у 1,1 раза пераўзыходзіць умоўны сусьветны ўзровень. Але гэты паказальнік губляе сваю эфэктнасьць, калі ўлічваць, што немцы жывуць ў 8,2 разы якасьней, чым агулам у сьвеце, а ў аўстрыякаў гэтая лічба дасягае ледзь не дзевяткі.

Аўтары аанаўскае справаздачы прыйшлі да высновы, што высокі, па мерках бальшыні беларусаў, узровень жыцьця пры канцы савецкага пэрыяду выклікае ў іх настальгію аб мінулым і змушае адмовіцца ад якой-кольвек уласнай вызначанасьці наконт сваёй будучыні.

Па выніках сацыялягічных дасьледаваньняў НАН Беларусі, на якія спасылаецца ў сваім артыкуле Анатоль Багдановіч, кольказь прыхільнікаў хуткага пераходу да рынкавае эканомікі з 1990 году паменшылася ўдвая. Больш як 40 адсоткаў беларусаў хацелі б, каб эканоміка разьвівалася па сацыялістычных прынцыпах. Багдановіч упэўнены, што «*грамадзяне Беларусі не ставяць знака роўнасьці паміж рынкам і капіталізмам... Адпаведна, сапраўдныя мэты тых пераўтварэньняў, што цяпер ажыцьцяўляюцца, шмат для каго зь іх незразумелыя. Гэта сьведчыць і аб нежаданьні насельніцтва адмовіцца ад сацыяльных гарантыяў мінулага грамадзкага ладу ды сацыялістычных каштоўнасьцяў*».

